тей и подростков представляет собой именно игровая зависимость, которую потом подхватывает гаджет-зависимость со всепоглощающей интернет-зависимостью, причем последняя – расстройство психического характера, при котором человек очень навязчиво желает войти в глобальную сеть и неспособен выйти из нее вовремя. На данный момент интернет-зависимость очень широко обсуждается, но еще не признано официальной болезнью [4].

Просветив себя в технической сфере, человек невольно осуществил серьезный крен, оторвав себя от мира духовного. Кроме того, есть и еще один удивительный нюанс. Технический прогресс, в целом, культивирует эгоистическое развитие человека. Ведь трудно отказаться от гаджета в пользу другого, трудно уступить просмотр телепередачи по телевизору для другого, трудно пропустить спешащего на автомобиле человека вперед.

Конечно же, благодаря техническому прогрессу стало легче добывать те или иные ресурсы, спасать жизни, устраивать свой быт. Но всегда есть пресловутое «но». Технический прогресс привел к созданию страшных орудий убийств, поставил перед человеком другие задачи, решение которых, порой, оборачивается печальными последствиями для массы других людей. Важно из всего этого извлечь простой урок: в не зависимости от масштабов исследований в первую очередь должен рассматриваться нравственный аспект изобретения, его влияние на общество на многие годы вперед.

Со своей стороны, каждый человек в какой-то степени может ограничить себя от воздействий технического прогресса. Для этого не нужно поддаваться пропаганде уже запрограммированного общественного мнения, которая замаскирована под модой, актуальностью и дружелюбностью общества. Формирование нравственности и морали в личности во многом зависит от семьи, воспитания, окружения, но главенствующую роль играет сама личность. Ведь сама по себе техника не вредна, но может ли каждый уверенно сказать, что он





один из тех немногих, кто не будет лениться, не будет культивировать тех или иных страстей?

**Литература и источники**

1. Франкл, В. Человек в поисках смысла: Сборник: Пер. с англ. и нем. / Общ. ред. Л. Я. Гозмана и Д. А. Леонтьева; вст. ст. Д. А. Леонтьева. – Москва : Прогресс, 1990 – 368 с.
2. Воображариум: святые отцы о виртуальной реальности / Электронный ресурс. URL: http://protoinfo.ru/voobrazharium-svyatyie-ottsyi-o-virtualnoy-realnosti. Дата обращения: 24.08.2018.
3. Вести. Выпуск от 23.08.18. / Электронный ресурс. URL: https://www.youtube.com/watch?v=-GxT1IolctM&list=PLLHjKKyQ4OaQNfEVb1ssl-yu2dGPLLS7r. Дата обращения: 24.08.2018.
4. Пыркин, И.В. Влияние научно-технического прогресса (нтп) на развитие личности и психическое здоровье человека / И.В. Пыркин // Научное сообщество студентов XXI столетия. Гуманитарные науки: сб. ст. по мат. IV междунар. студ. науч.-практ. конф. № 4. URL: sibac.info/archive/humanities/4.pdf. Дата обращения: 24.08.2018.

## МАГІЛЁЎСКАЯ ПРАВАСЛАЎНАЯ ЕПАРХІЯ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ II ПАЛОВЫ XVII – ПАЧАТКУ XVIII СТСТ.

*Поляк Н.А.*
*(Мінск Беларусь)*

Грамадска-палітычная сітуацыя II – ой паловы XVII ст. у Рэчы Паспалітай характарызавалася грунтоўным пераразмеркаваннем сіл. У ва ўсёй дзяржаве засталася толькі адна праваслаўная епархія – Магілёўская (Беларуская). Тры астатнія (Луцкая, Перамышельскай,

Львоўская) хутка прынялі ўнію. Паступова адыйшло ў нябыт казацтва, якое доўгі час выступала ўнутранай абарончай сілай праваслаўя. Вычарпалі свае рэзервы праваслаўныя брацтвы і шляхта. 20 год Беларуская епархія пасля смерці Тэадора Васілевіча (магілёўскі епіскап з 1669 па 1678 г.) заставалася без кіраўніка. Свае погляды на Магілёў усё часцей звярталі езуіты. З характэрнай упартасцю пераводзілі яны на ўнію праваслаўных вернікаў. З гэтай нагоды неаднойчы звярталіся да ўлад з патрабаваннем перадаць ім магілёўскую царкву Усяміласцівага Спаса, і змяніць кіраўніцтва епархіі на езуіцкае. Такім чынам, рэлігійна-веравызнаўчая сітуацыя склалася тут не на карысць праваслаўя.

Згодна з IX артыкулам "вечнага міру" (1686) асноўнай абаронцай праваслаўных у ва ўсёй Рэчы Паспалітай абвяшчалася Маскоўская дзяржава і гэта можна лічыць выхадам унутранага канфесійнага пытання за межы дзяржавы. З дапамогай расійскай дыпламатыі на Магілёўскую кафедру прызначаліся епіскапы Сільвестр Чацьвярцінскі, А. Берло, браты Валчанскія і інш., накіроўваліся камісары (Б. Шыпнеўскі, І. Рудакоўскі), арганізоўвалася актыўная перапіска з мясцовым праваслаўным святарствам і брацтвамі.

У 1717 г. для існавання праваслаўя ва ўсёй Рэчы Паспалітай і ВКЛ з'явілася рэальная пагроза. На сейме агучылі рашэнне аб тым, што "Рэч Паспалітая можа быць моцнай толькі тады, калі ў краіне будзе дамінаваць адно веравызнанне. З гэтай нагоды неабходна знішчыць не толькі праваслаўе, але і ўніяцтва" [1, с. 19]. Гэтыя абставіны актывізавалі барацьбу вакол Магілёўскай праваслаўнай епархіі.

На адрас расійскага манарха з беларускіх і літоўскіх манастыроў увесь час прыходзілі скаргі з просьбамі ўзяць пад ахову аднаверных. У 1720 г. С. Чацвярцінскі прасіў цара адшукаць свабоду адпраўлення набажэнстваў, магчымасць праваслаўным займаць магістрацкія пасады, вярнуць перайшоўшыя на ўнію цэрквы і манастыры ( з 1715 па 1720 г. каля 75 цэркваў), дазволіць праваслаўным духоўным асобам прымаць удзел у сенаце [2, с. 117].





Урэшце імператар даручыў расійскаму паслу ў Варшаве Г.Ф. Доўгарукаму і ваяводзе мазавецкаму Халентоўскаму скласці дакладнае паведамленне польскаму каралю аб рэлігійнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай і аб цяжкім становішчы праваслаўных. У адказ Аўгуст II выдаў прывілей, у якім прапаноўвалася стварыць пасады камісараў для разбору рэлігійных канфліктаў. Асноўнай мэтай іх працы было даследванне крыўд і свавольстваў уніятаў, прадстаўленне доказаў уціску праваслаўных і вяртанне ўсіх адабраных культавых установаў. На баку праваслаўных у Магілёве працаваў камісар І. Рудакоўскі, які за 3 гады вярнуў у праваслаўе 50 цэркваў і 3 манастыры. Камісар упэўніваў, што падтрымліваць праваслаўных у гэтым рэгіёне неабходна, гэта дыктуецца дзяржаўнымі інтарэсамі, бо адступіўшы ад гэтай веры мільён чалавек могуць стаць ворагамі Расійскай імперыі. Уніятаў неабходна трымаць на ланцугу і не дазваляць разрастання іх вольнасцей [3, с. 16].

Палітыка Аўгуста II у дачыненні да праваслаўных пасля смерці Пятра І стала больш жорсткай. Уніяцкі мітрапаліт Афанасій Шыптыцкі стаў галоўным ініцыятарам ліквідацыі апошняй праваслаўнай епархіі. Такога роду заклікі перыядычна гучалі ад папскіх нунцыяў ў Рэчы Паспалітай Вінцэнта Санціні, Каміла Мерліні.

Пасля смерці польскага караля Аўгуста II у Варшаве была арганізавана генеральная канфедэрацыя, якая аб'явіла рымакаталіцкае веравызнанне пануючым, астатнія веравызнанні, за выключэннем уніяцтва, не мелі права існаваць. Але абраны новы кароль Аўгуст III Сас (1733–1763), быў больш лаяльны да праваслаўных і не перашкаджаў дапамозе Расіі сваім аднаверным.

Новыя епіскапы, якія зацвярджаліся на Магілёўскую кафедру актыўна намагаліся палепшыць статус праваслаўных у грамадстве. Епіскап Іосіф Валчанскі некалькі разоў звяртаўся да Свяцейшага расійскага Сіноду з просьбамі аб матэрыяльнай дапамозе, інфармаваў аб стане цэркваў і манастыроў у сваёй пастве. [4, с. 63]. Пасля смерці

Іосіфа, працягнуў яго працу брат Геранім. У 1745 г. новы епіскап заняў Магілёўскую епархію з намерам вярнуць 124 перайшоўшыя на ўнію цэрквы. Ім быў складзены спецыяльны рапарт пад назвай "Спецыфіка манастыроў і цэркваў грэка-рускіх у розныя часы на ўнію гвалтам пазабіраных ад 1734 па 1743 г.". Дакумент інфармаваў аб акалічнасцях прыняцця праваслаўнымі цэрквамі ўніі. Вырашэнне ўзнятай Валчанскім задачы павінна было адбыцца на бліжэйшым сейме ў Гародні.

У першай палове XVIII ст. унію прыняла не мала праваслаўных прыходаў. Звычайна антыправаслаўныя дзеянні ініцыіравала шляхта і магнатэрыя, або каталіцка-уніяцкага духавенства. Рэлігійную нецярпімасць сама польская ўлада тлумачыла жаданнем грамадзян скасаваць галоўную зачэпку для ўмяшання замежных краін ва ўнутрыпалітычнае жыццё сваёй айчыны і даўнімі традыцыямі шляхецкай вольнасці [5, с. 116]. Але ж найбольшая колькасць праваслаўных, у параўнанні з астатнімі землямі Рэчы Паспалітай, усё ж такі заставалася на тэрыторыі ВКЛ, у асноўным на тэрыторыях віцебскага, мсціслаўскага, навагрудскага, брэст-літоўскага, кіеўскага і браслаўскага ваяводстваў. У праваслаўі заставалася 42 манастыры, юрыдычнае і матэральнае становішча якіх было не лёгкім. На дапамогу ім часам прыходзілі расійскія паслы і рэзідэнты ў Варшаве.

У 1755 г. пасля смерці магілёўскага ўладара Геранімa Валчанскага, расійская імператрыца Елізавета (1741–1762) пераняла ініцыятыву і дамаглася зацвярджэння ў Магілёў рэктара кіеўскай акадэміі, расійскага грамадзяніна Георгія Каніскага (1755–1785). Г. Каніскі распачаў шырокую палітычную дзейнасць і барацьбу за павелічэнне інтэлектуальнага ўзроўню духавенства сваёй паствы. Епіскап заснаваў магілёўскую духоўную семінарыю і друкарню, скончыў будаўніцтва кафедральнай царквы Святога Спаса. З дапамогай імператрыцы Елізаветы былі пабудаваны рэзідэнцыя беларускіх епіскапаў, царква святога Георга ў Пячэрску.

Значныя перамены ў жыцці праваслаўных Магілёва пачаліся з узыходам на расійскі трон Кацярыны II (1762–1796). Імператрыца





актыўна выкарыстоўвала бяспраўнае становішча праваслаўнага насельніцтва ў сваёй палітыцы, а лозунг абароны праваслаўных Магілёўскай епархіі быў заглаўным пры падзелах Рэчы Паспалітай.

Такім чынам, цэнтрам канфесійна-рэлігійнага і грамадска-палітычнага жыцця Княства і Кароны больш чым стагоддзе былі беларускія землі і горад Магілёў. Распачатая ў ім барацьба за валоданне праваслаўнай кафедрай прыцягвала погляды манархаў, тагачасных грамадскіх актывістаў, рэлігійнага кліра, шляхты і простых вернікаў. У адзначаны прамежак часу рэлігійнае спаборніцтва атаясамлівалася з палітычным і перамога ў ім азначала ўзмацненне ўплыву і павелічэнне сацыяльнай вагі.

**Літаратура і крыніцы**

1. Feldman, Józef. Czasy Saskie. Wybór ż ródeł / Józef Feldman. – Kraków, 1928.
2. Сборник документов, уясняющих отношения латино-польской пропоганды к русской вере и народности. – Вып.2. – Вильна, 1866.
3. Марозава, С.В. Пётр I на абароне сваіх адзінаверцаў на Беларусі / С.В. Марозава // Приграничное и региональное сотрудничество: новые задачи и пути решения. – Витебск, 1998. – С.16–19.
4. Likowski, E. Dzieje Kościoła unickiego na Litwie i Rusi w XVIII–XIX ww. Uważanie głównie ze względy na przyczyny jego upadku / E. Likowski. – Warszawa, 1906.

Konarski, S. Wybór pism politycznycg. / opr. Władysław Konopczyński. – Kraków : Krakowska spółka wydawnicza, 1921.